**ГАРБАВІЧЫ** – вёска ў Беладубраўскім сельскім Савеце (да 1997 г.) за 13 км на ПдЗ ад Касцюковіч і чыгуначнай ст. Камунары на лініі Крычаў – Сураж, 168 км ад Магілёва. Побач аўтадарога Краснаполле – Хоцімск.

Старажытная вёска Гарбавічы вядома з 16 ст. У 1585 г. упамінаецца як сяло, дзяржаўная ўласнасць. У 1589 г. пазначана як уласнасць казны.

У 1604 г. сяло ў Крычаўскім старостве, якое належала Радзівілам. Яны здавалі староства розным уладальнікам у арэнду. Арандатары даводзілі сялян да галечы завышэннем інвентарных павіннасцей, вымагалі буйныя грашовыя сумы. Усё гэта вымушала сялян да уцёкаў, астатнія сяляне неслі павіннасці і плацілі падаткі як за сябе, так і за ўцекачоў. У 1694г. 18 дымоў. Паводле інвентару Крычаўскага староства 1713г. – 6 валок зямлі. У 1727 г. сяляне з сяла Гарбавічы звярнуліся са скаргай да Радзівіла, што іх сяло даведзена да галечы і больш неплацежаздольнае. У 1779 г. сяло Гарбавічы – 37 двароў, 171 жыхар, у 1785 г. – 190 жыхароў, у Чэрыкаўскім павеце. У 1799 г. – 29 двароў, 169 жыхароў. Па рэвізіі 1834 г. 262 сялянскія душы. У 1880 г. вёска, 77 двароў. Частка вяскоўцаў апрача земляробства займалася бандарным, калёсным і кравецкім промысламі. Паводле перапісу 1897 г. – 105 двароў, 769 жыхароў у Студзянецкай воласці Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні.

У канцы 19 ст. вёска – цэнтр Гарбавіцкага сельскагаспадарчага таварыства, якому належала ў 1909 г. 869 дзесяцін зямлі. Вёска адносілася да праваслаўнага Дзяражненскага прыхода Архістраціга-Міхайлаўскай царквы. У 1908 г. адкрыта земская школа, якая размяшчалася ў наёмнай сялянскай хаце. У 1909 г. 113 двароў, 748 жыхароў. На базе дарэвалюцыйнай школы была створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1925 г. навучаліся 89 вучняў. У 1923 г. для школы быў узведзены будынак. З 20.08.1924 г. вёска ў Красніцкім сельсавеце Касцюковіцкага раёна Калінінскай, з 09.06.1927 г. Магілёўскай акругі. У 1926 г. у вёсцы 172 двары, 931 жыхар, размяшчалася алейня. У вёсцы быў створаны калгас “Верны шлях”, працавала кузня. Паводле перапісу 1959 г. – 383, у 1970 г. – 294 жыхары. У 1986 г. – 84 гаспадаркі, 221 жыхар, у складзе калгаса “Кранштат” (цэнтр – в. Вётухна). Працавалі пачатковая школа, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін. Планіровачна складаецца з 4-х паралельных паміж сабой рознай даўжыні вуліц, забудаваных двухбакова драўлянымі дамамі сядзібнага тыпу.

У выніку аварыі на Чарнобыльска АЭС жыхары ў 1997 г. перасселены ў п. Муравілле.